**А.М. Долбік (Мінск)**

## Грамадская атмасфера канца 1920-х гадоў у рамане Андрэя Мрыя “Запіскі Самсона Самасуя”

У рамане “Запіскі Самсона Самасуя” на прыкладзе населенага пункта Шапялёўкі паказана атмасфера, якая панавала ў савецкай дзяржаве ў канцы 1920-х гг. Пісьменнік стварае мадэль грамадства-механізму, дзе чалавек з’яўляўся ўсяго толькі шрубкай у вялікай машыне, а ўменне прыстасоўвацца і выконваць вызначаную функцыю цанілася вышэй за душэўныя якасці.

У рамане ўзнаўляецца шэрае, спакойнае жыццё шапялёўцаў, для якіх галоўнае – зручна ўладкавацца, прычым не заўсёды ў той сферы дзейнасці, якая сапраўды цікавіць. Інтэлігенцыя Шапялёўкі прадстаўлена маральна і духоўна збяднелымі людзьмі, непрафесіяналамі і невукамі. Так, доктар Зэлік не можа распазнаць цяжарнасць уласнай жонкі, настаўнік Мамон лічыць, што чалавек не мае права быць разумным без фізічнага выхавання, а ў настаўніцы Цыцохі “непераносная агіда да да дзяцей”. Сумным аўтару бачыцца стан адукацыі, дзе “вучні не навучыліся грызці навуковае каменне сваімі маладымі зубамі” [1, с. 64], а тых, што правяраюць узровень ведаў, цікавіць толькі адно пытанне: хто кіруе асветай у раёне.

Не лепшая сітуацыя і ў літаратурнай творчасці: ёй займаюцца людзі бязграматныя, душэўна глухія, якія зусім не маюць таленту. Увасабленнем маладых літаратараў у творы выступае рыфмаплёт Ягор Гарачы, што стварае паэму за паэмай: “Кроў і зялева”, “За тваім гарбатым носам нічога не бачу”… Гучны псеўданім Пушкінзон выяўляе яго амбіцыйнасць і жаданне стаць упоравень з класікам. Местачкоўцы ж захапляюцца нізкапробнымі творамі Гарачага, што сведчыць пра іх інтэлектуальны і культурны ўзровень. Аўтар рамана ўдала высмейвае такіх бязграматных, самазадаволеных, пагардлівых да працы селяніна людзей, якія прэтэндуюць на высокае месца ў грамадстве і лічаць сябе багемай.

А. Мрый насяляе Шапялёўку людзьмі з гаваркімі, характарыстычнымі прозвішчамі. Так, таварыш Сом паўстае важнай рыбінай на пасадзе старшыні райвыканкама. Вяртлявая рыбка Крэйна круціцца каля розных мужчын у імкненні прыстроіцца як мага лепш. Яшчэ адна рыба – Лін – увіхаецца за жанчынамі і лоўка вyслізгвае з самых небяспечных сітуацый… Яны, па сутнасці сваёй, нямыя рыбы, што жывуць інстынктамі і разам з тым ствараюць ілюзію актыўнай і гучнай дзейнасці. Грамадства ў рамане А. Мрыя маўклівае, адчувальнае да ціску “зверху”, няздольнае да адкрытых пярэчанняў начальству.

У рамане аўтар іранічна апісвае новае ў рэчаіснасці 1920-х гг. на знешнім, а таксама на больш глыбінным узроўні. Вонкавыя змены

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выяўляюцца, напрыклад, ва “ўдарных лозунгах”, развешаных з нагоды першамайскага свята: “Улік і кантроль”, “Культуру – у масы”, “Хараство – у масы”, “Мастацтва – у масы” і інш. За гучнымі фразамі хаваецца адсутнасць сэнсавай напоўненасці. Гэта ж адчуваецца і літаральна ва ўсіх “культурных” і “навуковых” мерапрыемствах у Шапялёўцы: у лекцыі “Аб рэлігіі як стадыі масавага шаленства”, у “сонечнай кампаніі” ШАЧ (Шапялёўская асацыяцыя чырванаскурых), у назвах вуліц (Вуліца вызвалення жанчын ад пялюшак, Вуліца т. Сома). А ў падхалімскай Самасуевай прапанове перайменаваць Шапялёўку ў Сомск выявілася агульная тэндэнцыя жыцця савецкай краіны: называць гарады у гонар партыйных бонзаў.

У мрыеўскай мадэлі грамадства яскрава паказана нараджэнне “новага чалавека”. Асабліва насцярожвае вобраз “новай жанчыны” – Крэйны Шуфер, свабоднай у адносінах да кахання, не скаванай маральнымі абмежаваннямі. Амаль адначасова яна адказвае на заляцанні Ліна, Самасуя, Сома, дзеля асабістай выгоды шукаючы “рыбу” з большым уплывам. Жанчынамі новага часу і новых поглядаў на жыццё можна назваць і настаўніцу Цыцоху, якая не любіць дзяцей і не збіраецца нараджаць, і тэлефаністку Мычку, што хоць і бачыць сэнс жыцця ў дзецях, але не хоча ствараць сям’ю і залежаць ад мужчыны.

А. Мрый беспамылкова адчуваў трывожныя сімптомы развіцця краіны: у эпізодзе таварыскага суда над Тарбай ён паказаў зараджэнне паказальных працэсаў над іншадумцамі: “Гэты працэс быў чыста судовым і з’яўляўся першай спробай нават у рэспубліцы” [1, с. 113]. Мясцовы філосаф уяўляў пэўную небяспеку для зладжанага, “механічнага” грамадства, і над ім арганізавалі суд, “каб выкрыць ідэалагічныя хістанні”. Выбраны пракурорам Самасуй па-здрадніцку абыходзіцца са сваім “настаўнікам”. Як доказы ў “шкоднай” дзейнасці былога сябра ён выкарыстоўвае яго запісную кніжку. Тут рэалізуецца футуралагічна-папераджальная функцыя мастацтва: прадбачанне тых злавесных рэпрэсій, якія ў рэальнасці сталі не толькі абсурднымі, як у рамане, але і абярнуліся крывамі падзеямі.

У тагачасным соцыуме панавала ідэя абсалютызацыі адзінай думкі, выключнай ролі партыйнай улады. Невук Самасуй усімі сіламі імкнецца ўступіць у шэрагі партыі, бо гэта дазволіць яму павысіць свой аўтарытэт у вачах шапялёўцаў. Ідэалогія пранікае нават у прыватнае жыццё: так, наколькі моцнымі былі захады па ўзмацненню ідэі камунізму, відаць з размовы дзяўчынак аб тым, што яны не будуць больш сябраваць з “беспартыйнай”: “Цяпер мне можна толькі з партыйнымі гуляць, а калі буду з табой, дык магу залезці ў балота і абрасці мяшчанствам” [1, с. 83].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У творы А. Мрыя, такім чынам, сатырычна завострана і ўтрыравана паўстае праўдзівая карціна жыцця ў краіне, дзе ўзялі верх самсоны самасуі. Раман стаў своесаблівым папярэджаннем аб тым, якая небяспека хаваецца ў бюракратычнай сістэме, што спараджае прайдзісветаў, кар'ерыстаў, жулікаў і руйнуе спрадвечныя асновы маралі.

Літаратура

1. Мрый, А. Творы : раман, апавяданні, нататкі / А. Мрый ; уклад. і прадм. Я. Лецкі. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 317 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ